**УДК 947.6**

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЗЛУЧЭННЯЎ ВІЛЕНСКА-НАВАГРУДСКАЙ АКРУГІ АРМІІ КРАЁВАЙ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ЛІПЕНІ 1944 – СТУДЗЕНІ 1945 ГОДА

***А.А. ЯРМАЦ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Даследуецца дзейнасць злучэнняў Арміі Краёвай, што існавалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля вызвалення рэгіёна ад фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года да афіцыйнага роспуску яе ў студзені 1945 года. Аналізуюцца розныя формы падпольнай барацьбы злучэнняў Арміі Краёвай, іх унутраная структура пасля арыштаў шэрага камандзіраў і афіцэраў і наступных кадравых змяненняў у кіраўніцтве Віленска-Навагрудскай акругі гэтай арміі. Вывучаецца ўплыў прапагандысцкай работы польскіх фарміраванняў на мерапрыемствы савецкай улады: мабілізацыю ў Чырвоную Армію, пастаўкі збожжа дзяржаве і інш. Звернута ўвага на актыўную тэрарыстычную дзейнасць атрадаў Арміі Краёвай у дачыненні да партыйных і савецкіх работнікаў, мясцовых актывістаў. Разгледжаны захады органаў дзяржаўнай бяспекі па ліквідацыі акаўскага падполля і іх асноўныя вынікі.*

**Уводзіны.** Вызваленне Беларусі ад нямецкіх захопнікаў не стала для жыхароў краіны заканчэннем вайны. У заходняй яе частцы разгарнулася барацьба паміж Чырвонай Арміяй, органамі бяспекі савецкай улады і прадстаўнікамі польскага нацыянальнага падполля. Паступовае пашырэнне кола даступных крыніц дае магчымасць больш глыбокага вывучэння гэтай маладаследаванай старонкі навейшай гісторыі Беларусі.

У сувязі з набліжэннем савецкіх войск, 12 ліпеня 1944 года кіраўніцтва Арміі Краёвай выдала да сваіх удзельнікаў адмысловую інструкцыю з правіламі паводзін у адносінах да Чырвонай Арміі "Адносіны да Саветаў". Так як савецкае кіраўніцтва не прызнавала польскі эмігранцкі ўрад, СССР называўся праціўнікам Арміі Краёвай. Камандзірам злучэнняў гэтай арміі рэкамендавалася без вайсковай неабходнасці не ўступаць у кантакты з савецкім вайсковым камандаваннем, а салдатам забаранялася весці палітычныя размовы з савецкімі байцамі. Галоўная ўвага ў дакуменце звярталася на тое, што ў выпадку прымусовага ўключэння атрадаў Арміі Краёвай у склад Чырвонай Арміі ці арміі Берлінга, рэкамендавалася пратэставаць, нават распускаць атрады і хаваць зброю. Ні ў якім разе не дазвалялася фарміраванням Арміі Краёвай першымі ўступаць у сутычкі з партызанамі і атрадамі савецкай арміі [1, с. 72].

**Асноўная частка.** Аддзелы Віленска-Навагрудскай акругі пасля завяршэння аперацыі "Вострая Брама" сканцэнтраваліся на поўдзень ад Вільні. Камендант акругі Аляксандр Кжыжаноўскі пайшоў на кантакт з кіраўніцтвам ІІІ Беларускага фронту для абмеркавання магчымага супрацоўніцтва. Але савецкі бок не разглядаў Армію Краёву ў якасці саюзніка. Неўзабаве кіраўніцтва гэтай арміі было запрошана на перамовы ў раён в. Багушы ля Вільні, дзе 17 – 18 ліпеня і было арыштавана 26 афіцэраў Віленска-Навагрудскай акругі Арміі Краёвай [2, s. 174 – 175]. У той жа дзень савецкімі органамі дзяржбяспекі быў арыштаваны Кжыжаноўскі. Усяго за два дні было раззброена больш 3 тысяч салдат, якія былі накіраваны на пункты збору для далейшай службы ў радах Чырвонай арміі і арміі Берлінга [3, с. 37]. Тым не менш большасць афіцэраў і салдат акругі пазбегла арыштаў і павінна было прымаць рашэнне аб сваіх далейшых дзеяннях. З-за частых кадравых перастановак і адсутнасці рэальнага кіраўніцтва, фактычна, кожны радавы камандзір сам вырашаў далейшы лёс свайго атрада – скласці зброю і ўступіць ў армію Берлінга, прабівацца на Захад альбо прадоўжыць барацьбу, але ўжо супраць савецкай улады на Віленшчыне і Навагрудчыне.

З ліку апошніх у канцы ліпеня – пачатку жніўня фарміравалася структура Віленска-Навагрудскай акругі Арміі Краёвай, якую ўзначаліў Ю. Кулікоўскі ("Рынграф"). Ён прыняў рашэнне аднавіць канспірацыйную сетку арміі ў рэгіёне [2, s. 176]. Галоўнаму штабу акругі падначальваліся злучэнні:

а) "Поўдзень", пад кіраўніцтвам Ч. Заянчкоўскага ("Рагнера"), дзейнічала ў Навагрудскім, Дзятлаўскім, Ляхавічскім, Лідскім і Жалудокскім раёнах;

б) "Поўнач", пад кіраўніцтвам Я. Барысевіча ("Крысі"), дзейнічала ў Воранаўскім, Радунскім і Васілішкаўскім раёнах;

в) "Усход", пад кіраўніцтвам Я. Камінскага ("Загон", "Аркан"), дзейнічала ў Іўеўскім, Юрацішкаўскім, Ашмянскім і Лідскім раёнах.

Злучэнне "Захад", якое таксама фігуравала ў дакументах органаў дзяржбяспекі, не было адноўлена [2, s. 178]. Акрамя злучэнняў, у склад акругі ўваходзілі асобныя брыгады, рэзервовыя абводы, "пляцуўкі", з якіх папаўняўся склад асноўных злучэнняў [4, с. 273].

Найбольш актыўную працу па рэарганізацыі сіл разгарнула злучэнне "Поўдзень". Пасля вызвалення Вільні сумеснымі намаганнямі савецкіх і польскіх падпольных сіл, у ліку тых кіраўнікоў польскіх нацыянальных фарміраванняў, што пазбеглі арышту ў ліпені 1944 года, быў і Чэслаў Заянчкоўскі. Яго атрад

падчас знаходжання ля Вільні адмовіўся скласці зброю па закліку савецкага камандавання і, больш таго, уступіў у бой з рэгулярнай часткай Чырвонай Арміі. У выніку большая частка атрада была рассеяна [5, с. 213].

З групай найбольш правераных паплечнікаў, каля трыццаці чалавек, "Рагнер" зрабіў спробу аднавіць канспірацыйную сетку Навагрудскай акругі на тэрыторыі Лідскага павета, дзе раней дзейнічала 311 "пляцувка" Арміі Краёвай. Вярнуўся на ўказаную мясцовасць Заянчкоўскі ў канцы ліпеня – пачатку жніўня 1944 года і адразу заступіў да актыўнай арганізацыйнай дзейнасці. На пасаду каменданта ўзброеных сіл у канспірацыі "Рагнерам" 5 жніўня 1944 года быў прызначаны Пётр Барташ ("Рычэ"). Пазней ён распаўсюдзіў свой першы загад, у якім называліся імёны яго намесніка Альфрэда Матулевіча ("Фрэда"), а таксама шэфа па спецыяльных заданнях Ежы Баклажэца ("Пазуркевіча") [6, а. 163].

Задачамі камендатуры, што ўзначальваў "Рычэ", былі каардынацыя ўсёй канспірацыйнай працы ў акрузе, ажыццяўленне кантролю над ідэйнай працай арганізацыі, дзейнасцю ўдзельнікаў раённых кампаній, правядзенне ўліку выканання загадаў і правільнасці рапартаў. Тэрыторыя злучэння падзялялася на ўчасткі, а тыя ў сваю чаргу на кампаніі. Злучэнне "Поўдзень" падзялялася на ўчасткі з канспірацыйнымі назвамі "Леон", "Клера", "Амеля", шэф кожнага з якіх павінен быў мець у распараджэнні трох сувязных і падводу. Праца арганізацыі была размеркавана па наступным аддзелам: арганізацыйны, разведкі, мабілізацыі, сувязі і прапаганды, канспірацыі, экзекуцыі, легалізацыі.

Кіраўнік прапаноўваў весці шыфраваныя дзённікі працы аддзяленняў, кожныя 10 дзён афармляць рапарты аб інспекцыі арганізацыі [6, а. 164].

У наступных загадах Заянчкоўскага і Барташа ўдакладняліся накірункі дзейнасці асобных аддзяленняў. Так, адказны за прапаганду "Фрэд" павінен быў забяспечыць друкаванымі матэрыяламі, радыё як удзельнікаў канспірацыі, так і насельніцтва, што непасрэдна не належала да Арміі Краёвай. Пры аддзяленні павінны былі існаваць адказныя за грамадзянскую, ваенную прапаганду і інш. У распараджэнне "Фрэда" былі перададзены радыёапараты, акумулятары да іх, фарбы, папера капіравальная і звычайная, што меліся на тэрыторыі злучэння. Каменданты асобных участкаў са згоды кіраўніка аддзела прапаганды ці самога "Рагнера" прызначалі ўчастковых шэфаў прапаганды. Асаблівая ўвага надзялялася таму, каб прапагандысцкія матэрыялы былі дастаўлены ў кожную вёску на тэрыторыі злучэння. Пры надзвычайных абставінах – набліжэнні да мясцовасці савецкіх атрадаў, напрыклад, задачай аддзялення было інфармаванне аб гэтым мясцовага насельніцтва. У кожнай вёсцы меркавалася мець двух сувязных. У выпадку трывогі яны дзяжурылі цэлы дзень, а ўначы чальцы арганізацыі павінны былі выстаўляць узброены патруль. Абавязкам камандзіра кожнага ўзвода было папярэджанне акаўцаў суседніх вёсак аб набліжэнні праціўніка, інфармаванне кіраўніцтва аб колькасным і якасным складзе частак праціўніка, што знаходзяцца на тэрыторыі размяшчэння ўзвода [6, а. 164 – 165].

Камандзіры асобных участкаў павінны былі да 1 кастрычніка 1944 года прадставіць "Пазуркевічу" інфармацыю аб сваім колькасным складзе, указаць у рапартах колькасць і від узбраення па кожнай кампаніі. Новыя чальцы прымалі прысягу з дазволу каменданта кампаніі ці яго намесніка. Непасрэдна асабісты склад узброеных сілаў у канспірацыі падзяляўся на тры катэгорыі: часткі для спецыяльных заданняў, аддзелы "першай гатоўнасці", аддзелы "другой гатоўнасці".

Да аддзелаў "першай гатоўнасці" адносіліся ўзброеныя фарміраванні, што выконвалі непасрэдныя заданні кіраўніцтва. У іх склад уваходзілі патрулі і пасты, атрады для выканання асобных задач. Пасля задання камандзіры адпускалі салдат дахаты да атрымання загада аб наступнай аперацыі. Раз у тыдзень павінны былі праводзіцца нарады з мэтай вайсковага навучання.

Аддзелы "другой гатоўнасці" ўключалі ўсіх чальцоў канспірацыі нават простых прыхільнікаў Арміі Краёвай, знаёмых з ужыццём зброі. У кожнага каменданта ўзвода павінны былі быць спісы мабілізаваных па вёсках. Аб размяшчэнні складоў зброі на тэрыторыі ўчастка ведалі толькі камендант і яго намеснік.

Важкая роля адводзілася аддзяленню экзекуцыі і ваенна-палявому суду. На падставе данясенняў разведкі ці пратаколаў камендантаў "пляцувак" выносіўся прысуд, за выкананне якога адказвала аддзяленне экзекуцыі. Згодна загаду № 2 ад 18.09.1944 пакарання смерцю заслугоўвала "невыкананне загадаў сваіх камандзіраў, здрада ці праца супраць польскага народа ці польскай дзяржавы, у адносінах да чальцоў арганізацыі, а таксама да асоб, што не з'яўляюцца яе чальцамі" [6, а. 165]. Камандзір злучэння меў права памілавання. Відавочна, што прысуды маглі выносіцца і мірным жыхарам.

Аддзяленне разведкі сваю працу мусіла сканцэнтраваць на выяўленні агентуры народнага камісарыята ўнутраных спраў і асоб, што супрацоўнічаюць з савецкай уладай.

У вышэйпададзеных загадах адзначалася, што каменданты асобных кампаній і ўзводаў не маюць права рэквізіцыі харчу і грошай у мясцовага насельніцтва. Усе гэтыя справы афармляе самастойна камандзір рэквізіцыйнага патруля [6, а. 164 – 165].

У рэгіёне, дзе дзейнічалі атрады злучэння "Поўдзень", назіралася байкатаванне мерапрыемстваў савецкай улады з боку мясцовага насельніцтва. Так, на 8 верасня 1944 года дзяржаўныя пастаўкі збожжа ў Лідскім раёне былі выкананы на 6 %, у Шчучынскім – на 7, у Жалудокскім – на 13 % [2, s. 182].

Згодна данясенню загадчыка Палітаддзела ЦК КП(б)Б ад 9 верасня 1944 года 362 ваеннаабавязаныя палякі ў Лідскім раёне адмовіліся прымаць павесткі [7, а. 114]. За перыяд з 2 жніўня да 14 лістапада 1944 года ў Лідскім раёне было забіта 66 і паранена 7 чалавек з ліку партыйнага і савецкага актыву [8, а. 6].

“Рагнер” меў у сваім распараджэнні добра ўзброеную мабільную групу з 100 – 120 чалавек, якая давала магчымасць праводзіць даволі актыўную дзейнасць [9, с. 25]. Так, 3 верасня 1944 года старшыня гарсавета, старшыня гарнізона і кіраўнік народнага камісарыята ўнутраных спраў г. Ліды атрымалі па пошце лісты наступнага зместу: “У адказ на бесперапынныя затрыманні безабароннага грамадзянскага насельніцтва, зверскія забойствы салдат Чырвонай Арміі даводжу да вас, што часткі Арміі Краёвай супрацьпаставяць сілу. З 4.09 да 9.09 затрымаем рух па чыгунцы. Калі акупацыйныя савецкія ўлады будуць працягваць тэрор у далейшым, часткі Арміі Краёвай прыступяць да дзеянняў у адказ, і кожны савецкі работнік і салдат будуць лічыцца бандытамі з выцякаючымі адсюль наступствамі. Камандзір Наднёманскага злучэння Рагнер” [8, а. 23]. Пагрозы былі выкананы на працягу наступных дзён. У ноч з 4 на 5 верасня ля Ліды быў падарваны чыгуначны мост, у ноч на 6 верасня была пашкоджана ўжо сама чыгунка, а ў адным з паравозаў на ст. Ліда выбухнула толавая шашка [8, а. 23].

Усяго на працягу жніўня – снежня 1944 года атрады Заянчкоўскага здзейснілі 86 тэрарыстычных акцый, 6 дыверсій, 24 узброеныя напады [2, s. 183].

Такім чынам, можна вылучыць некалькі галоўных накірункаў дзейнасці польскіх нацыянальных фарміраванняў у Заходняй Беларусі ў азначаны час: сабатаж мерапрыемстваў савецкай улады (мабілізацыя ў Чырвоную Армію, пастаўкі збожжа дзяржаве і інш.), дыверсіі, тэрарыстычныя акты, вусная і пісьмовая агітацыя. На гэтых формах дзейнасці засяродзіліся ўдзельнікі і іншых структурных частак польскага падполля ў Заходняй Беларусі.

Так, яшчэ ў маі 1944 года ў адмысловай Інструкцыі “Асновы паводзін польскай грамадскасці ў выпадку акупацыі паўночна-ўсходніх земляў савецкімі войскамі” (май 1944)”, распаўсюджанай Бюро інфармацыі і прапаганды Арміі Краёвай, адзначалася, што “ў выпадку мабілізацыі ў савецкую армію, усе грамадзяне Рэчы Паспалітай, а таксама палякі і іншыя павінны ўхіляцца ад службы ў савецкай арміі... належыць ухіляцца ад усялякіх палітычных маніфестаў, афіцыйных святкаванняў і інш.” [7, а. 72]. Сярод мясцовага насельніцтва распаўсюджваліся друкаваныя матэрыялы: газеты, пракламацыі, лістоўкі, а таксама звычайныя чуткі. Так, у Баранавіцкай вобласці ў ліпені 1944 года распаўсюджвалася лістоўка наступнага зместу: “Палякі павінны працягнуць барацьбу за сваю Польшчу, бо ад аднаго (нямецкага) акупанта пазбавіліся, але прыйшоў больш злы і небяспечны акупант – бальшавізм. Ніякай падтрымкі ПКНВ і арміі Берлінга як бальшавіцкім агентам” [10, а. 77 – 78]. На Навагрудчыне распаўсюджвалася адозва ад кіраўніцтва акругі Арміі Краёвай: “Грамадзяне! Новы ўдар спасціг нашыя атрады, нашай арміі, якая пралівала кроў у барацьбе з нямецкімі захопнікамі, дапамагала Чырвонай арміі ў перамозе. Але атрады былі падманам сабраны ў адно месца і раззброены. Большая частка нашых салдат знаходзіцца ў бальшавіцкіх турмах. Так, бальшавікі адплацілі нам за дапамогу, аказаную па загаду нашага ўрада ў Лондане. Зараз мы не сумняваемся. Ведаем, што Чырвоная армія супраць волі Англіі і Амерыкі прынесла нам цяжкую долю новай акупацыі. Чакаюць нас новыя турмы і здзекі, Сібір, рабства... За апошні час бальшавікі абвесцілі мабілізацыю. Нагласць, да якой не дайшлі нават немцы. Нас можа мабілізаваць толькі польскі ўрад у Лондане. Бальшавікі пагоняць Вас ці на самыя небяспечныя ўчасткі фронту, ці на мяжу з Японіяй, у Сібір. І тое, і іншае для нас – смерць. Неабучаныя (бальшавікам няма часу навучаць) мы загінем на нямецкім фронце. На мяжы з Японіяй вас чакае галодная смерць. Мы пратэстуем супраць мабілізацыі. На тэрор бальшавікоў адкажам сілай. Мы не павінны ісці таксама і ў армію Берлінга. Ведаем, што яна абараняе інтарэсы бальшавікоў, прадала палову Польшчы і хоча зрабіць тут бальшавіцкі рай. Хто ідзе ў армію Берлінга, той вораг нашага народа і дзяржавы” [11, а. 23].

У паведамленні аб ходзе мабілізацыі ў Жабычыцкім раёне Пінскай вобласці адзначаецца, што “з выкліканых на прызыўныя ўчасткі 2500 чалавек не з’явілася 617, шмат з іх сышлі ў лясы, “масавая няяўка з’яўляецца вынікам варожай работы агентаў польскага лонданскага ўрада, які распускае чуткі, што нібы тэрыторыя раёна па дамоўленасці Амерыкі з Англіяй адыходзіць зноў да Польшчы… на мясцовае насельніцтва гэтая агітацыя мае даволі моцны ўплыў. На хлебаўборку ўраджая не выходзяць цэлымі вёскамі” [10, а. 77 – 78]. Кіраўніцтва Ляхавіцкага раёна Баранавіцкай вобласці паведамляла 30.10.1944, што шырокае распаўсюджванне сярод насельніцтва маюць чуткі аб хуткім вяртанні Заходняй Беларусі ў склад Польшчы [10, а. 51]. Істотную ролю ў паспяховасці агітацыйнай работы сыграў удзел у ёй некаторай часткі каталіцкага духавенства [4, а. 279]. Не дзіўна, што і частка польскага насельніцтва рэгіёна падтрымлівала меры падполля і ўдзельнічала ў прапагандзе. У в. Багдзюкі Камянецкага раёна, напрыклад, некаторыя сем’і 11 лістапада на сваіх хатах вывешвалі невялікія польскія сцяжкі з надпісам “Няхай жыве Польшча” [8, а. 9].

Акрамя агітацыі, дзеля зрыву мабілілізацыі і іншых дзяржаўных мерапрыемстваў, выкарыстоўваліся і іншыя меры. 3 жніўня ў 5 км ад Васілішак была абстраляна са станкавага кулямёта група мабі-

лізаваных, у выніку чаго ёсць параненыя, а 32 чалавекі прапалі без вестак. Запалохваліся і ваенныя камісары асобных раёнаў. Астравецкаму раёнваенкому, напрыклад, быў падкінуты ананімны ліст: “На днях прибудем и всех вас уничтожим” [7, а. 115]. Не дзіўна, што такія меры прыносілі плён.

Па стану на 9 верасня 1944 года ў Івянецкім раёне Баранавіцкай вобласці з ліку выкліканых на прызыўныя пункты 748 чалавек ніхто не з’явіўся. У Радуньскім і Воранаўскім раёнах была сарвана мабілізацыя конскага складу [7, а. 115]. Сакратар Воранаўскага РК КП(б)Б паведамляў кіраўніцтву, што “нягледзячы на актыўную прапагандысцкую работу, падчас мабілізацыі павялічваецца колькасць дэзертыраў і ўхіленцаў. З агульнай колькасці прызваных у 1000 чалавек добраахвотна з’явілася 200; 85 чалавек былі знойдзены падчас праверкі па населеным пунктам; 39 збегла падчас канваіравання на пункт прызыву. У сельскія саветы выехалі групы партыйна-савецкага актыву з прадстаўнікамі абласнога ваенкамата”. Ім жа паведамляецца, што ўзброеныя групы пераймаюць падводы, што вяртаюцца з лесанарыхтовак, пагражаюць і збіваюць працуючых, пасля чаго ніхто не хоча ехаць і працаваць на нарыхтоўках, “што з’яўляецца галоўным тормазам па выкананні лесанарыхтовак” [12, а. 115].

Асабліва складанай была сітуацыя ў тых раёнах Гродзенскай, Маладзечанскай абласцей, дзе польскае насельніцтва пераважала. Так, у Астравецкім раёне з 1506 ваеннаабавязаных на прызыўныя пункты на 15 жніўня 1944 года з’явілася толькі 98 (6,5 %), у Свірскім з 4197 – 313 (7,5 %), у Ашмянскім з 2674 – 675 (25,2 %) [13, а. 223].

Адным з галоўных накірункаў дзейнасці Арміі Краёвай было здзяйснененне тэрарыстычных актаў. Камендант злучэння “Поўнач” у інструкцыі ад 30.09.1944 для камендантаў “пляцувак” фактычна даваў поўную свабоду тэрарыстычнай дзейнасці сваім падначаленым у адносінах да партыйна-савецкага актыву, чырвонаармейцаў і мясцовых актывістаў [4, а. 285].

22 жніўня 1944 года ля Воранава акаўцамі быў здзейснены напад на вайсковую машыну, у выніку якога было забіта два салдаты Чырвонай арміі і забрана 160 аўтаматаў, 6 станкавых кулямётаў “Максім”, 6 супрацьтанкавых ружжаў [7, а. 116]. Акаўцамі праводзіліся аперацыі па вызваленні сваіх паплечнікаў, арыштаваных органамі дзяржаўнай бяспекі. У Свірскім раёне Вілейскай вобласці 19.8.1944 група з 50 чалавек напала на сельскі савет, знішчыла ўсе дакументы па ўліку насельніцтва, зямельных угоддзяў. Імі ж былі вызвалены кіраўнікі некаторых атрадаў Арміі Краёвай, што дзейнічалі на тэрыторыі раёна [10, а. 95].

Ад рук падпольшчыкаў гінулі прадстаўнікі мясцовай улады. За першыя два з паловай месяцы 1945 года ў Гродзенскай вобласці зафіксавана 53 тэракты, у якіх загінула 69 асоб, а 10 паранена [14, s. 157]. У Маладзечанскай вобласці да кастрычніка 1945 года адзначана 57 атак на сельскія саветы, калгасы і г.д. Як правіла, яны суправаджаліся спаленнем будынкаў, знішчэннем дакуметацыі, сабатажам мерапрыемстваў савецкай улады. У вобласці загінула ад рук падполля 150 асоб, у тым ліку 55 партыйных функцыянераў, 64 вяскоўцаў-актывістаў. Паранена яшчэ 30 асоб [15, а. 11]. Толькі ў Сапоцкінскім раёне Гродзенскай вобласці за май 1945 года зафіксавана 17 акцый польскага падполля, хоць за гэты ж час тут было праведзена 10 аперацый органаў бяспекі з прачэсваннем тэрыторыі раёна. У Юрацішкаўскім раёне за першы месяц 1945 года забіта 39 чалавек з раённага актыву і работнікаў органаў народнага камісарыята ўнутраных спраў і народнага камісарыята дзяржаўнай бяспекі [13, а. 107]. У Іўеўскім раёне за 20 дзён студзеня 1945 года загінула ад антысавецкіх банд 15 чалавек партыйнага і савецкага актыву, у тым ліку старшыня і сакратар райвыканкама. Да раённага цэнтра Валожын на адлегласць 5 – 6 км падышлі тры шматкольkасныя польскія атрады і размясціліся ў мясцовых вёсках. На працягу некалькіх дзён у раёне было забіта 12 чалавек з ліку актывістаў і супрацоўнікаў бяспекі [13, а. 109].

У такіх складаных абставінах прадстаўнікі ўлады ў вёсках імкнуліся пакінуць месцы працы і перабіраліся ў райцэнтры, дзе сітуацыя была больш бяспечнай. У верасні 1944 года ў Іўеўскім раёне працавала толькі 3 сельскіх саветы з 15. Работнікі астатніх выехалі ў горад [7, а. 114].

**Заключэнне.** Баявы патэнцыял злучэнняў Арміі Краёвай, тым не менш, паступова згасаў. Не была завершана праца па іх арганізацыі. Кіраўнік злучэння “Поўдзень” паведамляў аб недахопе харчавання, абмундзіравання, дэзерцірстве, дрэнным маральным стане салдат [16, а. 44]. Галоўнай жа прычынай была актыўная дзейнасць органаў дзяржаўнай бяспекі супраць польскага падполля. Імі было праведзена некалькі аперацый з мэтай ліквідацыі злучэння. Падчас адной з іх, у пачатку кастрычніка 1944 года, быў знойдены склад боепрыпасаў і штабныя дакументы “Рагнера” на тэрыторыі Лідскага раёна [7, а. 137]. 3 снежня 1944 года ля х. Ярэмічы Лідскага раёна быў забіты сам «Рагнер». У канцы снежня распачалася чарговая аперацыя НКУС – НКДБ, вынікам якой стаў разгром злучэння “Поўдзень” у студзені 1945 года. Было забіта больш 300 і арыштавана больш 200 удзельнікаў злучэння [1, с. 75].

У другой палове 1944 – пачатку 1945 года органамі бяспекі і ўнутраных спраў БССР былі ліквідаваны таксама галоўныя сілы злучэнняў “Усход” і “ Поўнач”, падчас чаго было забіта 100 і арыштаваны 171 удзельнік польскага падполля [1, с. 75].

Тым не менш прынятыя меры былі толькі першымі крокамі па нармалізацыі становішча ў рэгіёне. Асабовы склад Арміі Краёвай, які пазбег арышту ў 1944 – пачатку 1945 года, працягнуў сваю дзейнасць, пе-

райшоўшы ў глыбокае падполле. Пасля загаду аб роспуску Арміі Краёвай ад 19 студзеня 1945 года, які насіў даволі фармальны характар, адбылося частковае аднаўленне структуры Арміі Краёвай у Заходняй Беларусі.

ЛІТАРАТУРА


1. Валаханович, И.А. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944 – 1953 гг. / И.А. Валаханович. – Минск: БГУ, 2002. – 148 с.
2. Boradyn, Z. Armia Krajowa na Nowogrodczyznie i Wilenszyznie, 1941 – 1945 / Z. Boradyn, A. Chmielarz, H. Piskunowicz. – Warszawa, 1997. – 195 s.
3. НКВД и польское подполье 1944 – 1945. (По «Особым папкам» Сталина). – М.: Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1994. – 305 с.
4. Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939 – 1954 гг.) / С.А. Ситкевич [и др.]. – Гродно: ГГАУ, 2004. – 345 с.
5. Сямашка, Я. Армія Краёва на Беларусі / Я. Сямашка. – Мінск: Беларус. выдавец. т-ва "Хата", 1994. – 416 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 161.
7. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 61.
8. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 812.
9. "Ты з Усходняй, я з Заходняй нашай Беларусі…". – Мінск: Беларус. навука, 2009. – Кн. 2: Ліпень 1944 – 1956 гг. – 299 [2] с.
10. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 810.
11. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 56.
12. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 42.
13. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 42. – Спр. 150.
14. Ruchniewicz, M. Wies zachodniobialoruska 1944 – 1953. Wybrane aspekty / M. Ruchniewicz. – Wroclaw, 2010. – 445 s.
15. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 98.
16. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 29. – Спр. 33.


*Пастуміў 14.11.2011*

## ACTIVITIES OF THE COMPOUNDS OF THE HOME ARMY OF THE VILNIUS-NAVAHRUDAK COUNTY IN THE WESTERN BELARUS FROM JULY 1944 TILL JANUARY 1945

***A. YARMATS***

*Article is devoted to the activities of the compounds of the Home Army, which existed in the territory of Western Belarus after the liberation from Nazi invaders in the region in July 1944, before the formal dissolution of the Home Army in January 1945. Analyzes the various forms of resistance to compounds of the Home Army, its internal structure after the arrests of a number of commanders and officers, and subsequent personnel changes in the leadership of the Vilnius-Navahrudak County Home Army. The influence of advocacy groups in the Polish events of Soviet power: the mobilization of the Red Army, the supply of grain to the state and others. Attention is paid to active terrorist activities units of Home Army in respect of Party and Soviet officials, local activists. Consider the measures of public authorities to eliminate underground and their main results.*